**А.А.Жалуновіч,** *дацэнт*
**В.С.Варапаева,** *дацэнт*

# МОДУЛЬНАЯ АРГАНІЗАЦЫЯ ВУЧЭБНАГА ПРАЦЭСУ ПА БЕЛАРУСКАЙ МОВЕ І ДЗІЦЯЧАЙ ЛІТАРАТУРЫ Ў ВНУ КУЛЬТУРЫ І МАСТАЦТВАЎ

Модульнае навучанне – адна з маладых альтэрнатыўных тэхналогій сучаснай адукацыі. Сваю назву модульнае навучанне атрымала ад слова “модуль”, адно са значэнняў якога – “функцыянальны вузел”. Пад модульнай тэхналогіяй навучання разумеюць рэалізацыю працэсу навучання метадам раздзялення яго на пэўную сістэму “функцыянальных вузлоў”, прычым прадугледжваецца, што запланаваныя вынікі навучання здзяйсняюцца пры ўмове адназначнага выканання модуляў студэнтамі.

Аўтар “*Лінгвадыдактычнага энцыклапедычнага слоўніка*” А.Н.Шчукін дае такое азначэнне: “Модульнае (ад *лац.* modulus – мера) навучанне – арганізацыя адукацыйнага працэсу, пры якім вучэбная інфармацыя падзяляецца на модулі (адносна закончаныя і самастойныя адзінкі, часткі інфармацыі). Сукупнасць некалькіх модуляў дазваляе раскрыць змест пэўнай вучэбнай тэмы ці нават усёй вучэбнай дысцыпліны. Модульнае навучанне садзейнічае актывізацыі самастойнай вучэбнай і практычнай дзейнасці вучняў” [1, с. 161].

Так, частка выкладчыкаў, што абапіраюцца на замежную педагогіку, разумеюць паняцце “модульнае навучанне” як навучанне, арганізаванае на падставе прынцыпаў модульнага падыходу, іншыя, якія ўдзельнічаюць у эксперыменце па развіцці гнуткіх модульных структур школьных аб’яднанняў (М.В.Антропава, Н.А.Сарокін, С.Е.Хазэ і інш.) вызначаюць модульнае навучанне як навучанне, якое выхоўвае, развівае.

Модульнае навучанне павінна мець дакладнае структураванне зместу вучэбнага курса па прадмеце, сутнасць якога раскрываецца з дапамогай дыдактычных модуляў. Кожны з такіх модуляў з’яўляецца адначасова банкам інфармацыі і метадычным указаннем па яго выкарыстанні. Пабудова адзінак вучэбнага матэрыялу (па

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

мове ці літаратуры) у выглядзе дыдактычных модуляў арыентуецца на дакладна абумоўленыя вынікі навучання – кампетэнцыю.

Для вывучэння кожнага модуля распрацоўваецца вучэбны дапаможнік, у якім утрымліваецца неабходная інфармацыя для фарміравання пэўных ведаў і ўменняў, а таксама заданні кантролю ці тэсты. Такім чынам, можна сказаць, што сродкамі модульнага навучання з’яўляюцца:

– праграма навучання (яна індывідуалізаваная па змесце, метадах навучання, узроўні самастойнасці, а таксама па тэмпе навучання);

– падручнік (з’яўляецца базавым матэрыялам для агульнага засваення);

– электронны варыянт курса лекцый (дадатковы матэрыял, які скіроўвае студэнта на самастойную працу ў пошуку і засваенні навейшай інфармацыі);

– матэрыялы кантролю (накіраваны на дыягностыку сфарміраванасці вызначанай кампетэнцыі): тэсты (электронны варыянт), кантрольныя работы, пераклады, рэфераты, красворды, эсэ і інш.;

– матэрыялы для самастойнай работы (накіраваны на пашырэнне ведаў у галіне фарміравання прафесійных навыкаў і ўменняў), пры гэтым трэба кіравацца існуючымі нарматыўнымі дакументамі, перш за ўсё Агульнаадукацыйным класіфікатарам, а таксама назапашаным вопытам ВНУ Рэспублікі Беларусь [1–3].

Укараненне модульнай тэхналогіі ў вучэбны працэс ВНУ культуры і мастацтваў мае пэўную перавагу перад жорсткім і малаэфектыўным тлумачальна-ілюстрацыйным працэсам падачы матэрыялу. Гэта звязана з вялікай разнастайнасцю спецыяльнасцей і спецыялізацый, калі канкрэтна гаварыць аб БДУ культуры і мастацтваў. Так, напрыклад, шэраг спецыялістаў, якіх рыхтуюць факультэты культуралогіі і сацыякультурнай дзейнасці; традыцыйнай беларускай культуры і сучаснага мастацтва; факультэт інфармацыйна-дакументных камунікацый, працуюць у дзіцячых калектывах ці маюць дачыненне да дзіцячай аўдыторыі (праводзяць дзіцячыя ранішнікі, свята кнігі, пішуць сцэнарыі для дзяцей, ладзяць забаўляльныя праграмы ў хоспісе, абслугоўваюць маленькіх чытачоў і іх бацькоў у раённых бібліятэках і г.д.). Тым не менш курс “Дзіцячая літаратура” застаўся па-за рамкамі агульнаадукацыйных курсаў як сусветнай, так і беларускай літаратуры і з’яўляецца курсам спецыялізацыі толькі на факультэце

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

інфармацыйна-дакументных камунікацый. Мэтазгоднасць уключэння дзіцячай літаратуры ў якасці самастойнага вучэбна-пазнавальнага модуля для іншых спецыяльнасцей відавочная. Недахоп ведаў фактычнага матэрыялу ў студэнтаў, немагчымасць кампетэнтнага прафесійнага кіравання ў галіне літаратурнага багацця сусветнай дзіцячай літаратуры з боку выкладчыка не спрыяюць стварэнню станоўчых матываў для навучання і збядняюць сэнс гуманітарнай падрыхтоўкі.

І калі разглядаць агульнаадукацыйны курс літаратурнай падрыхтоўкі як базавы модуль, засваенне зместу якога абавязковае для ўсіх студэнтаў універсітэта ў адпаведнасці з Адукацыйным стандартам вышэйшай адукацыі першай ступені, то курс "Сусветная літаратура для дзяцей і юнацтва" адносна гэтага можна вызначыць як вучэбна-прафесійны модуль. Такім чынам, названы курс складаецца з 5 модуляў.

Модуль 1 – *класічная дзіцячая літаратура.* Прадугледжваецца знаёмства студэнтаў з праблемамі спецыфікі літаратуры для дзяцей і юнацтва, лепшымі творамі, прысвечанымі дзецям, якія ўвайшлі ў круг іх чытання.

Модуль 2 – *руская дзіцячая літаратура XX і пачатку XXI ст.* Раскрываецца складаны літаратуразнаўчы працэс, выяўляюцца лепшыя здабыткі і майстэрства пісьменнікаў і паэтаў.

Модуль 3 – *беларуская дзіцячая літаратура.* Раскрываецца нацыянальная спецыфіка для дзяцей і юнацтва, аналізуюцца творы разнастайнай тэматыкі і праблематыкі.

Модуль 4 – *замежная літаратура для дзяцей і юнацтва*. Вывучаюцца англійская, амерыканская, французская, балгарская і іншыя літаратуры.

Модуль 5 – *кантралюючы.* Пабудаваны з улікам прафілізацыі і спецыфічных форм кантролю: вядзенне студэнтамі чытацкіх дзённікаў і іх аналіз выкладчыкам, падрыхтоўка навучэнцамі праблемных паведамленняў, рэфератыўных аглядаў крытычнай літаратуры, гутарак рэкамендацыйнага характару і па прачытаных кнігах, бібліяграфічных даведак, напісанне рэцэнзій, складанне анатаваных спісаў, выкананне творчых прац.

Кожны з модуляў – закончаны, мае свае формы кантролю: залік і экзамены.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Змест гэтага курса павінен стаць даступным і абавязкова ўключаным у лік прадметаў, якія забяспечваюць вучэбна-прафесійную кампетэнцыю будучых спецыялістаў універсітэта культуры і мастацтваў: педагогаў, псіхолагаў, сацыяльных педагогаў, сацыяльных работнікаў, рэжысёраў масавых свят, менеджэраў сацыякультурнай сферы, бібліятэкараў усіх спецыялізацый.

Модульнае навучанне задае новы вектар пабудовы навучання: стварэнне станоўчых матываў да вучобы дзякуючы навізне зместу, займальнасці, эмацыянальнаму зместу, арганізацыі вучэбнага пошуку, апоры на жыццёвы вопыт, пераадоленню пазнавальных цяжкасцей. Гэта, у сваю чаргу, абавязвае выкладчыка беларускай мовы адказаць на пяць асноўных пытанняў педагогікі: хто?, што?, каму?, для чаго? і як выкладаць? Адказ на пастаўленыя пытанні нацэльвае выкладчыка на пошук новых метадаў і тэхналогій, па сутнасці, прымушае задумацца, як навучаць рэзультатыўна. Магчыма, перш за ўсё трэба праз змест курса пабачыць чалавека ў розных сацыякультурных сферах.

Для гэтага праграма навучання мове прадугледжвае разам з абавязковым базавым модулем увядзенне вучэбна-прафесійнага модуля, у які ўваходзяць тры самастойна завершаныя модулі.

Модуль 1 – *навуковы стыль.* Утрымлівае характарыстыку форм маўленчай дзейнасці: вуснае маўленне (функцыянальна-семантычная характарыстыка тыпаў тэкстаў); пісьмовае маўленне (жанравая і кампазіцыйная дыферэнцыяцыя навуковых пісьмовых работ, моўныя канструкцыі, якія афармляюць навуковыя пісьмовыя работы).

Модуль 2 – *афіцыйна-дзелавы стыль*. Утрымлівае функцыянальна-семантычныя тыпы тэкстаў афіцыйна-дзелавога характару; жанравую і кампазіцыйную дыферэнцыяцыю дзелавых папер.

Модуль 3 – *культура прафесійнага маўлення*. Уключае змест камунікатыўнай кампетэнцыі ў сацыякультурнай і паўсядзённай сферах маўлення; камунікатыўныя сітуацыі (кейс-тэхналогія) – паўсядзённая сфера зносін, вучэбна-прафесійная сфера зносін; формы маўленчага этыкету; моўныя канструкцыі, якія забяспечваюць формы маўленчага этыкету; інтанацыйныя канструкцыі як сродак афармлення фразы (ІК – 1, ІК – 2, ІК – 3, ІК – 4).

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Такім чынам, эфектыўнасць новага віду навучання, якое названа модульным, звязана з яго дынамічнасцю, варыятыўнасцю элементаў, модуляў, зместу элементаў і модуляў, індывідуалізацыяй навучання на аснове пастаяннай дыягностыкі з мэтай вызначэння ўзроўню ведаў, патрабаванняў, індывідуальнага тэмпу дзейнасці студэнта.

---

1. *Лобанов, А.П.* Управляемая самостоятельная работа студентов в контексте инновационных технологий / А.П.Лобанов, Н.В.Дроздова. – Мн., 2005.

2. *Педагогические* основы самостоятельной работы студентов / под ред. О.Л.Жук. – Мн., 2005.

3. *Сергеенкова, В.В.* Управляемая самостоятельная работа студентов. Модульно-рейтинговая и рейтинговая системы / В.В.Сергеенкова. – Мн., 2004.

4. *Щукин, А.Н.* Лингводидактический энциклопедический словарь: более 2000 единиц / А.Н.Щукин. – М.: Астрель: АСТ: Хранитель, 2007. – 746 [6] с.; [150] фот.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ